**С. М. Тычына**

# ЭКСПРЭСІЯНІЗМ У ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ

Сусветны літаратурны працэс першай паловы XX ст. вызначыўся разнастайнымі мастацкімі эксперыментамі, якія тычыліся як формы, вобразаў, так і зместу твораў. У гэты час ўзнікалі шматлікія мастацкія плыні, якія суіснавалі, узаемаўзбагачаліся і дапамагалі аўтару намацаць свой ўласны творчы шлях. Яскравыя прыклады спалучэння рыс розных мастацкіх плыняў ў беларускай літаратуры можна назіраць у творчасці пісьменнікаў пачатку XX ст.: Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, З. Бядулі, М. Гарэцкага і інш.

У мастацкіх тэкстах Я. Купалы беларускія даследчыкі адзначалі рысы рамантызму, рэалізму і сімвалізму. Найбольш увагі літаратуразнаўцы ўдзялялі праявам рамантызму ў тэкстах беларускага класіка. Пра гэта сведчыць і артыкул «Рамантызм творчасці Янкі Купалы» ў энцыклапедычным даведніку 1986 года, у той час як іншым плыням асобнага месца ў манументальнай працы не знайшлося. Тым не менш, у тым жа артыкуле гутарка ідзе і пра рэалізм, які ў творчасці Я. Купалы цесна знітаваны з рамантызмам: «У К. амаль няма вобразаў, створаных чыста рэаліст. сродкамі тыпізацыі:

адметны, вельмі своеасаблівы купалаўскі рэалізм амаль заўсёды ідзе побач з рамантызмам, з «матэрыялізацыяй» суб'ектыўнага пачатку, які не можа знайсці апоры ў тыповасці характараў і абставін» (І. Я. Навуменка 1986). Сімвалізм, як блізкі паэту напрамак, не згадваецца ў даведніку наогул (у артыкуле «Сімвал у творчасці Янкі Купалы» У. Конан адзначае, што сімволіка беларускага аўтара арганічна спалучае рэалістычныя і рамантычныя пачаткі (У. М. Конан 1986), што тлумачыцца асаблівасцямі развіцця літаратуразнаўства ў той час, бо І. Навуменка, аўтар артыкула «Рамантызм творчасці Янкі Купалы», ужо ў раздзеле «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя» (1999 г.) піша: «Янка Купала не прайшоў міма пэўных мастацкіх форм, выпрацаваных паэтамі-сімвалістамі і імпрэсіяністамі, яны мелі на яго бясспрэчны ўплыў» (І. Я. Навуменка 1999). Надзвычай цікавае даследаванне, прысвечанае праявам сімвалізму ў творчасці Янкі Купалы, было праведзена П. Васючэнкам у манаграфіі «Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм».

Наогул, калі разглядаць літаратурную спадчыну Янкі Купалы з пункту погляду асаблівасцей той або іншай плыні, вынікае, што значная частка яго твораў утрымлівае адначасова рысы розных кірункаў. Пры гэтым, на праяўленні рыс, характэрных для экспрэсіянізму, у творчасці беларускага класіка ўвага не акцэнтуецца. Тым не менш некаторыя вершы Я. Купалы нясуць адзнакі гэтай плыні. Сам экспрэсіянізм, як вынікае нават з самой назвы, звязаны з выражэннем моцных пачуццяў. «Пратэстуючы супраць сусветнай вайны і сацыяльнай несправядлівасці, супраць бездухоўнасці жыцця і прыгнечанасці асобы сацыяльнымі механізмамі, а часам і звяртаючыся да рэвалюцыйнай тэмы, майстры экспрэсіянізму сумяшчалі пратэст з жахам перад хаосам быцця» (Н. С. Павлова 1987). Творчасць Янкі Купалы ў цэлым надзвычай насычана эмоцыямі, адчуваннямі, аўтар вельмі трапна падбірае словы, для таго, каб перадаць настрой героя або асабістыя пачуцці. Таму чытач вельмі добра адчувае тое, што адбываецца ў душы героя або аўтара. Творы Я. Купалы, ці гэта вершы, ці гэта п'есы, ці гэта артыкулы, ўражваюць сваёй здольнасцю перакананаць, прымусіць адчуваць і суперажываць. Несумненна, на эмацыянальны прынцып пабудовы твора апіраўся і сімвалізм, але экспрэсіянізм рабіў акцэнт найперш на супярэчнасцях, якія ўзнікаюць паміж асобай і соцыумам, падкрэсліваў залежнасць асобы ад сацыяльнага быцця, што праяўляецца, напрыклад, у такіх творах Я. Купалы, як «Смейся!..» і «Маё цярпенне» (вершы былі напісаны ў 1915 г.). Кожны радок гэтых твораў не проста насычаны пачуццямі, унутранымі перажываннямі, тут аўтар перадае адчай, звязаны з ўсведамленнем нікчэмнага становішча чалавека, які не можа выказаць свой боль, закрычаць на ўвесь свет, звярнуць на сябе ўвагу у сувязі з тым, што ён бачыць сябе членам ці невялікай, нязначнай часткай грамадства (а па-сутнасці, кропляй у моры): «Маё цярпенне, мой крывавы боль – // Што значыць перад мукамі мільёнаў…»,

«Мой крык перад малітвай свету – ноль!», «I веру я, што я нішто ў быцці – // Іначай думаць не дае сумленне…»;»I не важся ад сэрца ўздыхаці, // Ласкі ждаць…» (Я. Купала 2001).

Чалавек залежыць ад іншых людзей, ад іх меркавання. Усё, што ён можа прапанаваць людзям – сваё сэрца, сваю душу: «Ха-ха-ха-ха! Душу сваю выні, // Палажы на далонь і надзейся, // Што павераць табе, што не згіне // Ўся прысяга твая ў чорнай ціне // Перасудаў людскіх…» (Я. Купала 2001). Вершы «Смейся!..» і «Май цярпенне» вельмі дакладна ілюструюць наступнае выказванне з «Літаратурнага энцыклапедычнага слоўніка»: «У цэнтры мастацкага сусвету экспрэсіянізму – змардаванае бяздушнасцю сучаснага свету, кантрастамі жывога і мёртвага, духа і цела, «цывілізацыі» і «прыроды» сэрца чалавека» (Н. С. Паўлова 1987). Напрыклад, кантраст жывога і мёртвага перадаецца ў вершы «Смейся!..» праз аксюмаран «жывыя трупы». Лірычны герой твора знаходзіцца на мяжы вар’яцтва, на мяжы адчаю, на мяжы прорвы, у якую ў любы момант ён можа абрынуцца, на мяжы жыцця і смерці: «Вырывай з сябе жылу па жыле, // Ві ў вяроўку, ў пятлю і павесся, // I, пакуль у зямлю не зарылі, // Хоць дух будзе шыпець у бяссіллі, – на сваіх вісі жылах і смейся!» (Я. Купала 2001). Тым не менш заклік «смейся!», які гучыць у канцы кожнай страфы, – гэта спроба вярнуць чалавека да жыцця, да змагання за сябе, да пошуку сілы, якая падтрымае ў цяжкі для чалавека момант, нават тады, калі, здаецца, наступае апошняя хвіліна і ўжо нічога зрабіць нельга: «Смейся смехам – хрыпеннем быдляці // З перарэзаным горлам, і грэйся // Ў гэтым храпе скрозь стогн і пракляцце, // I не важся да сэрца ўздыхаці, // Ласкі ждаць… Хоць крывёю, а смейся!» (Я. Купала 2001).

Такім чынам, у творах Янкі Купалы можна выявіць рысы розных плыняў, якія цесна спалучаюцца і пераплятаюцца адна з адной. Цікавасць да розных спосабаў выяўлення жыццёвых фактаў, чалавечых гісторый, сваіх уласных назіранняў, перажыванняў, думак, ідэй сведчыць пра складаныя творчыя пошукі аўтара, які, несумненна, здолеў знайсці свой арыгінальны, непаўторны, адметны творчы стыль.